УДК 655.41:655.42

А.М. Бадак, дырэктар
(ВРУП «Мастацкая літаратура», г. Мінск)

# ВЫДАВЕЦТВА «МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА» НА КНІЖНЫМ РЫНКУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Сёлета выдавецтва «Мастацкая літаратура» адзначае свой паўвекавы юбілей. Менавіта пяцьдзясят гадоў таму, 6 сакавіка 1972 г. была прынята пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў Беларускай ССР №58 аб стварэнні на базе рэдакцый мастацкай і дзіцячай літаратуры выдавецтва «Беларусь» новага выдавецтва, якое, у першую чаргу, павінна выдаваць мастацкія творы беларускіх пісьменнікаў. Такое рашэнне было цалкам апраўданым: айчынная літаратура развівалася хуткімі тэмпамі, імёны многіх паэтаў і празаікаў ужо былі добра вядомыя за межамі Беларусі. Усё гэта патрабавала большых выдавецкіх аб’ёмаў і, адпаведна, большага выдавецкага штату.

Як і напачатку сваёй дзейнасці, сёння «Мастацкая літаратура» выдае арыгінальныя творы беларускіх пісьменнікаў, Зборы твораў, выбраныя творы знакамітых айчынных аўтараў, кнігі па літаратуразнаўстве і крытыцы, лепшыя творы замежных пісьменнікаў, літаратуру для дзяцей і падлеткаў, а таксама навукова-папулярную і публіцыстычную.

У сваёй выдавецкай дзейнасці мы імкнемся адлюстроўваць увесь жанравы і ўзроставы спектр айчыннага прыгожага пісьменства, пры гэтым нязменна прытрымліваючыся галоўнага прынцыпу: усё, што прымаецца да выдання, павінна быць напісана таленавіта. Невыпадкова нашы кнігі рэгулярна становяцца пераможцамі міжнародных і рэспубліканскіх літаратурных конкурсаў.

Кнігі серый «Жыццё знакамітых людзей Беларусі», «Наш современник», «Мастакі Беларусі», «Беларусь музычная», «Наши герои» набылі папулярнасць і сталі візітнай карткай выдавецтва. Іх героі – вядомыя нашы суайчыннікі: кінарэжысёр Міхаіл Пташук, кампазітары Яўген Глебаў, Васіль Раінчык, мастакі Алесь Савіцкі, Мікола Селяшчук, Уладзімір Тоўсцік, Уладзімір Пракапцоў, Аляксей Кузьміч, Іван Міско, актрыса Марыя Захарэвіч, спявачка Наталля Гайда, пісьменнікі Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Кузьма Чорны, Аркадзь Куляшоў, Мікалай Чаргінец, касманаўт Алег Навіцкі і інш.

Не меншай папулярнасцю карыстаюцца і літаратурныя серыі: «Беларуская проза ХХ стагоддзя», «Беларуская паэзія ХХ стагоддзя», «Беларуская проза ХХІ стагоддзя», «Беларуская паэзія ХХІ стагоддзя», «Бібліятэка выбраных твораў», «Напісанае застаецца»,

«100 вершаў», у якія ўваходзяць лепшыя творы айчынных аўтараў – як класікаў, так і сучаснікаў.

«Казкі XXI стагоддзя», «Беларуская аўтарская казка», «Нашым дзеткам», «Казачны свет», «Пазакласнае чытанне», «Жывая класіка дзецям», «Я люблю чытаць»… Гэтыя ды іншыя серыі «Мастацкай літаратуры» добра вядомыя і любімыя юнымі чытачамі. У іх уваходзяць як творы, што ўжо прайшлі праверку часам і ўключаны ў школьныя праграмы па літаратуры, так і зусім новыя, якія, магчыма, з часам таксама трапяць у залаты фонд айчыннага прыгожага пісьменства.

Выданне Збораў твораў класікаў беларускай літаратуры займае асаблівае месца ў працы выдавецтва.

У розныя гады ў нас выходзілі Зборы твораў Якуба Коласа, Янкі Купалы, Кузьмы Чорнага, Змітрака Бядулі, Максіма Гарэцкага, Кандрата Крапівы, Аркадзя Куляшова, Петруся Броўкі, Івана Шамякіна, Янкі Брыля, Івана Мележа, Васіля Быкава, Максіма Лужаніна, Пімена Панчанкі, Максіма Танка, Уладзіміра Караткевіча, Івана Пташнікава, Івана Навуменкі і іншых айчынных класікаў.

На працягу апошняга часу «Мастацкая літаратура» выдае Збор твораў народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля ў 10 тамах і Збор твораў Уладзіміра Караткевіча ў 25 тамах.

Прэмія «Золата Парыжа», Гран-пры Міжнароднага конкурсу дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў у Маскве, шматлікія ўзнагароды на міжнародных і рэспубліканскіх конкурсах кнігі за поспехі, дасягнутыя ў мастацка-тэхнічным афармленні і паліграфічным выкананні,

Мы значна актывізавалі выхад на міжнародныя кніжныя праекты. Так, за апошнія гады выдалі кнігу «Гісторыя Фінляндыі» і кнігу вядомага фінскага пісьменніка Цімы Парвелы «Эла і сябры».

Асабліва цесныя партнёрскія адносіны ў нас склаліся з Кітаем. Сярод кніг кітайскіх пісьменнікаў, якія апошнім часам выйшлі ў нас у перакладзе на беларускую мову, можна назваць зборнік «Пялёсткі лотаса і хрызантэмы. Сто паэтаў Кітая XX стагоддзя», кнігу выбраных твораў класіка кітайскай паэзіі Ай Ціна «Гімн святлу», а таксама паэтычную серыю «Светлыя знакі: паэзія Кітая». У 2020 годзе выдавецтва «Мастацкая літаратура» заключыла пагадненне з Кітайскім выдавецтвам літаратуры на замежных мовах аб выданні першага і другога тамоў кнігі Сі Цзіньпіна «Аб дзяржаўным кіраванні» і падпісала Мемарандум аб выданні трэцяга тома. На дадзены момант ідзе праца над перакладам другога тома гэтай кнігі.

І, канешне, мы заўсёды вялікую ўвагу ўдзяляем новым творам сучасных беларускіх пісьменнікаў.

Некалькі слоў пра новыя беларускія праекты. Летась мы пачалі праект «Народная бібліятэка» і папрасілі людзей розных прафесій і ўзросту назваць любімыя творы Максіма Багдановіча. Творы, якія ў выніку сабралі найбольш галасоў, увайшлі ў паэтава «Выбранае». Пасля гэткім жа чынам выдалі двухтомнікі Янкі купалы і Васіля Быкава. У хуткім часе пабачаць свет двухтовнікі Якуба Коласа і Уладзіміра Караткевіча.  Для юных чытачоў мы нядаўна пачалі выдаваць серыю “100 пытанняў пра Беларусь”.

Мы жывём у час, калі кніжны рынак ставіць кожнае выдавецтва ў вельмі жорсткія ўмовы выжывання. І, зразумела, гэта датычыцца не толькі Беларусі. Самая шматлікая аўдыторыя – тая, у якой літаратура ўсяго толькі сродак для адпачынку. Гэта аматары жаночых раманаў, танных дэтэктываў, фэнтэзі, трылераў, альтэрнатыўнай гісторыі. Выдаўцы прапануюць ім просценькія раманы для аднаразовага прачытання, напісаныя па адной і той жа не сёння распрацаванай схеме, у аснове якой удала закручаны сюжэт з гарой трупаў ці любоўным трохкутнікам. Спадзяюся, кажучы так, я нікога не крыўджу: і дома за сталом пераважная большасць з нас далёка не гурманы: яечня, пельмені – чым не сняданак? Літаратурныя гурманы – катэгорыя нешматлікая, як і сама проза ці паэзія такога кшталту. Таму такая літаратура часцей за ўсё не самая запатрабаваная, але затое яна вельмі жывучая, у адрозненне ад так званай масавай літаратуры, бульварнага чытва. Знаўцы сапраўднай, выкшталцонай паэзіі як цанілі вершы Міхася Стральцова ў сямідзясятыя, так цэняць і сёння. Прычым большасць з іх – гэта ўжо сённяшняя моладзь, што асабліва радуе. У сур’ёзных кніг сёння меншая чытацкая аўдыторыя, але роля іх у грамадстве была, ёсць і будзе вельмі вялікая. І не трэба баяцца слова «меншая». Пагадзіцеся, на свеце жыве вельмі шмат людзей, якія ніколі не бралі ў рукі Біблію, але на якіх яна таксама аказала вялікі ўплыў, бо Слова ўздзейнічае на нас і праз вусны, і праз сэрцы іншых людзей. Таму для нас вельмі важна і ў сённяшніх умовах захаваць прыярытэты, вызначаныя нашымі папярэднікамі, тымі, хто стаяў каля вытокаў стварэння выдавецтва: найперш выпуск высакаякасных твораў нашых сучаснікаў і перавыданне найлепшых узораў класічнай літаратуры. Пры гэтым наша задача – даказаць пэўнай катэгорыі чытачоў, што і сур'ёзная літаратура таксама можа быць цікавай і нават захапляльнай.

І я перакананы, што ў Кнігі яшчэ вельмі доўгае жыццё. А значыць, і «Мастацкая літаратура» яшчэ доўга будзе радаваць чытача сваімі кніжнымі навінкамі.